
Аўтасэрвіс без сертыфікацыі?


Лепш невялікі заробак, чым ніякі

СТАР.2


Ці адкрыецца дом-музей Алеся Адамовіча?

СТАР. 4

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. СЕРАДА № 208 (28066) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЯК МАДЭРНІЗУЕМСЯ?

**Прэзідэнт Беларусі, Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Аляксандр Лукашэнка наведаў 120-ю асобную механізаваную брыгаду Паўночна-заходняга аперотыўнага камандавання Узброеных Сіл, дзе азнаёміўся з узорамі мадэрнізаванага ўзбраення і ваеннай тэхнікі.**

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб арганізацыйна-штатнай структуры, дыслакацыі брыгады, выкананні Дзяржаўнай праграмы па ўладкаванні ваенных гарадкоў, а таксама арганізацыі заняткаў па баявой падрыхтоўцы з выкарыстаннем сучасных камп'ютарызаваных трэнажораў. Прэзідэнт пацікавіўся, наколькі эфектыўная падрыхтоўка на трэнажорах. На думку міністра абароны Андрэя Раўкова, гэты метад з'яўляецца сапраўды эфектыўным і да таго ж дазваляе паменшыць выдаткі на падрыхтоўку спецыялістаў.

Затым Аляксандр Лукашэнка наведаў Пакой баявой славы, дзе адлюстравана гісторыя 120-й асобнай механізаванай брыгады, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Кіраўнік дзяржавы пакінуў запіс у памятнай кнізе, дзе пажадаў воінам славутага злучэння быць вартымі светлай памяці герояў-аднапалчан. Кіраўнік дзяржавы пабываў таксама ў адной з казармаў брыгады, дзе азнаёміўся з арганізацыяй жыцця і быту вайскоўцаў.

Аляксандр Лукашэнка, змяніўшы праграму наведвання брыгады, зайшоў таксама ў салдацкую сталовую, дзе яму паказалі, як і чым харчуюцца вайскоўцы, а таксама па-за праграмай наведаў і медыцынскую роту.

На вайсковым стрэльбішчы Прэзідэнту былі паказаны ўзоры ваеннай тэхнікі, баявой формы адзення, экіпіроўкі і стралковай зброі, якую плануецца прыняць на ўзбраенне механізаваных брыгад.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся таксама з тактыка-тэхнічнымі характарыстыкамі пісталетаў і іншай стралковай зброі, якая маецца на ўзбраенні ва Узброеных Сілах (у тым ліку гістарычнай зброі часоў Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў). Прэзідэнту былі прадэманстраваны элементы тактычнай стральбы з выкарыстаннем сучасных айчынных аптычных сродкаў.

## ЗРАБІЦЬ СВОЙ ГОРАД БОЛЬШ ЯРКІМ

### выказалі намер удзельнікі дзіцячага парламента з Брэста падчас мерапрыемстваў з нагоды 70-годдзя ААН

**Удзельнікі акцыі «Экспрэс ААН-70: на шляху да партнёрства для развіцця» правялі ў Брэсце цэлы шэраг розных мерапрыемстваў. Першым з іх стала падпісанне Дэкларацыі прыхільнасці рэгіёна Мэтам устойлівага развіцця. Свае подпісы пад дакументам паставілі намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Міхаіл Сяркоў і прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН у Беларусі Рашэд Мустафа Сарвар.**

Адной з адметных падзей гэтага дня можна, відаць, назваць правядзенне парламенцкіх слуханняў Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў, дзіцячага і маладзёжнага парламента Брэста на тэму «Развіццё адукацыі і сацыялізацыя моладзі». Перад пасяджэннем прадстаўнікі розных школ горада правялі невялікія прэзентацыі праектаў, якія яны ажыццяўляюць у сферы грамадскага жыцця. Адзін з іх называецца «Зробім горад больш яркім». Гэтае пачынанне аб'яднала самых юных гарадскіх мастакоў, графітыстаў, якія сапраўды ўпрыгожваюць горад. Маладыя людзі робяць малюнкі на фасадах, сценах, фрагментах агароджы. Аўтары праекта падкрэслілі, што такі гурток па інтарэсах дазволіў накіраваць ініцыятыву мастакоў-падлеткаў у пазітыўнае рэчышча і заахвочваць тых, хто сапраўды мае творчыя здольнасці. Дзеці паказалі здымкі сваіх работ, якія дакладна надалі асобным будынкам абласнога цэнтра яркасць і прывабнасць.

Другі цікавы праект называецца «Падары ўсмешку дзецям». Гэта спроба школьнікаў навучыцца сапраўднаму валанцёрству, якое падразумявае спагаду і дапамогу. Удзельнікі гуртка ходзяць у дзіцячую бальніцу са сваёй «клоўнатэрапіяй»: іх выступленні спрыяюць адаптацыі маленькіх пацыентаў у новых умовах на карысць хутчэйшага ачуньвання.

Калі Рашэд Мустафа Сарвар пазнаёміўся з дзіцячымі ініцыятывамі і праектамі, ён сказаў старшыні Брэсцкага гарадскога Савета Міколаю Красоўскаму: «Віншую вас! У вас такая цікавая, неабыякавая моладзь!».

У гэтым маглі пераканацца і ўдзельнікі парламенцкіх слуханняў. У зале нараўне з дэпутатамі гарадскога прадстаўнічага органа ўлады выступалі школьнікі і студэнты. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны Валянцін Мілашэўскі выказаў упэўненасць, што сённяшнія ўдзельнікі дзіцячага і маладзёжнага парламента будуць добрымі спецыялістамі ў сваёй галіне, стануць міністрамі і парламентарыямі і, несумненна, годна прадстаўляць нашу краіну на міжнародным узроўні.

Знакавым можна назваць і навукова-метадалагічны семінар, які прайшоў у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна. Форум атрымаў назву «70 гадоў ААН і шляхі далейшага ўмацавання супрацоўніцтва паміж народамі». У рамках канферэнцыі вучоныя прадставілі цікавыя даклады па розных аспектах сумеснай работы, пераадолення глабальных праблем і выклікаў сучаснасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## ТРЫМАЙЦЕСЯ КАРАНЯМІ!



Работнікі «Мінскзеленбуда» садзяць маладыя дрэвы ў Лошыцкім парку.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Шляхамі Скарыны

## КНІГАЙ БЛАСЛАВЁНЫЯ

***У** гэтую дарогу мяне бласлявіў ён сам. Маршрутка на Полацк імчала па яшчэ сонным пад першымі промнямі кастрычніцкага сонца Мінску, а ён, у бронзе, захутаны ў цьмянае золата халаднаватага святла, стаяў, урачыста ўскінуўшы рукі, і кніга, узнесеная да неба, была з ім. Выпадкова ці не, але ў XXI стагоддзі Францыск Скарына праводзіць усіх, хто выязджае з Мінска менавіта ў напрамку яго роднага Полацка, і сустракае тых, хто з Полацка прыязджае. Постаць чалавека з кнігай не губляецца на фоне гмаха Нацыянальнай бібліятэкі: яна значная, неад'емная частка архітэктурнай кампазіцыі, без якой і наш славуты «алмаз» не выглядаў бы так урачыста і дасканала. Зрэшты, а ці магло ў Беларусі быць інакш?*

*У мяне на стале ляжыць мая першая Біблія. Падораная атэістычна выхаванай школьніцы ў далёкім 89-м, яна перавярнула калісьці такі правільны і зразумелы, здавалася, свет. А яшчэ — падарыла, бадай, першае па-сапраўднаму дарослае, усвядомленае пачуццё гонару за сваю зямлю, за свой народ, за ўласную да іх прыналежнасць. Бо ў той кнізе, акрамя кананічных тэкстаў, быў дадатак. У якім — надзвычай цікавая табліца: у якім годзе кожны з народаў СССР (ад рускіх да нанайцаў) атрымаў Святое Пісанне на нацыянальнай мове. 1517-ы насупраць графы «беларусы» вылучаны шрыфтам. Невыпадкова: гэтая дата на сто, на дзвесце, на трыста, а то і на чатырыста гадоў ранейшая, чым многія астатнія.*

*Праз пяцьсот гадоў з таго часу, як «Псалтыр» пачаў гісторыю беларускага кнігадрукавання і працягнуў гісторыю беларускага асветніцтва, я спрабую прайсці шляхам Скарыны. Убачыць тое, што мог бачыць ён, згледзець яго сляды нават у сучасным увасабленні, даведацца пра яго як мага больш, сустрэўшыся з дасведчанымі людзьмі, для якіх скарыніяна — не прыгожы неалагізм, а сапраўдная навука... Урэшце, зразумець і адчуць, што рухала гэтым чалавекам у яго падзвіжніцкай справе. Што ён сёння — для Беларусі, для беларусаў, для ўсяго свету...*

СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

## Br2 млн 811,1 тысячы

*склаў сярэдні памер прызначаных пенсій у верасні гэтага года, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Сярэдні памер вераснёўскіх пенсій у 2,4 раза перавышае бюджэт пражытковага мінімуму для пенсіянераў (у адпаведнасці з пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ад 20 ліпеня 2015 года бюджэт пражытковага мінімуму для пенсіянераў у цэнах чэрвеня ў разліку на месяц на перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка гэтага года складае Br1 млн 193,2 тысячы). У верасні сярэдні памер пенсій па ўзросце склаў Br2 млн 897,3 тыс., па інваліднасці — Br2 млн 562 тыс., з прычыны страты карміцеля — Br1 млн 924,2 тыс., сацыяльных пенсій — Br1 млн 419,7 тыс.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17358,00 | ▲ |
| Еўра | 19189,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 273,17 | ▼ |
| Укр. грыўня | 760,90 | ▲ |

## УВАГА, ПРАМАЯ ЛІНІЯ!

**Паляўнічыя і рыбаловы, рыхтуйце пытанні!**

Як заказаць праз інтэрнэт пуцёўку на паляванне? Ці можна замест агнястрэльнай зброі выкарыстоўваць лук і арбалет? Ці патрэбна радаслоўная сабаку, якога бяруць на паляванне?

Даведацца адказы на гэтыя пытанні і задаць свае можна будзе падчас **«прамой лініі» ў рэдакцыі «Звязды» са старшынёй Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Юрыем Іванавічам ШУМСКІМ**.

Яна пройдзе ў рэдакцыі «Звязды» **30 кастрычніка з 11 да 12 гадзін**. Тэлефануйце ў гэты час на нумар (017) 287 18 71.

Папярэдне свае пытанні можна пакінуць па нумары (017) 287 18 38 або даслаць іх на e-mail pryroda@zviazda.by.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У Польшчы перамагла партыя экс-прэм'ера Качыньскага



Апазіцыйная кансерватыўная партыя «Закон і справядлівасць» былога прэм'ер-міністра Польшчы Яраслава Качыньскага атрымала перамогу на праведзеных у мінулую нядзелю парламенцкіх выбарах, набраўшы 37,58% галасоў, паведамляе TVN24. Па неафіцыйных звестках, «ЗіС» зойме 232 крэслы ў ніжняй палаце парламента, якая складаецца з 460 месцаў. На другім месцы апынулася ліберальная партыя прэм'ер-міністра Эвы Копач «Грамадзянская платформа» з 24,09% галасоў. Трэцім стаў рух рок-музыкі Паўла Кукіза «Kukiz'15» (8,81% галасоў). У партыі «Закон і справядлівасць» раней заявілі, што кандыдатам на пасаду прэм'ер-міністра краіны будзе Беата Шыдла, якая падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў узначальвала перадвыбарчы штаб цяперашняга прэзідэнта краіны Анджэя Дуды.

### Колькасць ахвяр землятрусу ў Афганістане перавысіла 350 чалавек



Не менш за 350 чалавек сталі ахвярамі землятрусу магнітудай 7,5 бала, які адбыўся ў афганскай правінцыі Бадахшан. Як паведаміла пакістанская газета The Nation, загінулыя ёсць у самім Афганістане, а таксама ў Пакістане і Індыі. Найбольшы ўрон землятрус нанёс Пакістану, а менавіта прымежнай з Афганістанам правінцыі Хайбер-Пахтунхва і так званай «зоне плямёнаў». Па апошніх звестках, загінулі 275 чалавек, пацярпелі звыш 2 тыс. Разбураны сотні дамоў. Не менш за 70 чалавек загінулі ў Афганістане, звыш 200 пацярпелі.

ISSN 1990 - 763X

15208>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Мясныя прадукты занеслі ў пералік канцэрагенаў

Сусветная арганізацыя аховы здароўя выпусціла папярэджанне адносна бекону, каўбасных вырабаў і іншай апрацаванай мясной прадукцыі. Гэтыя прадукты, з пункту гледжання правакавання раку, такія ж небяспечныя, як і цыгарэты, адзначае The New Zealand Herald. Оксфардскія спецыялісты даказалі, што спажыванне ўсяго чатырох порцый мясных вырабаў за тыдзень павышае рызыку раку кішэчніка больш як на 40%. Навукоўцы мяркуюць: злучэнне з мяса пашкоджвае ДНК клетак у стрававальным тракце. Вынік — рак. Сёння 4 з 10 мужчын і кожная дзясятая жанчына спажываюць больш за 90 грамаў чырвонага або апрацаванага мяса ў дзень. Мясныя прадукты вэндзяць, дабаўляюць соль і хімічныя кансерванты накшталт нітратаў і нітрытаў (бургеры і фарш). Некаторыя эксперты звязваюць павышаную рызыку раку менавіта з дабаўкамі ў мясных прадуктах. Аднак СААЗ у любым выпадку звязвае чырвонае мяса з ракам. Свежае чырвонае мяса арганізацыя збіраецца паставіць трохі ніжэй за апрацаванае мяса, прысвоіўшы яму катэгорыю «верагодны канцэраген». Але не варта забываць, што мяса карыснае для здароўя. У ім шмат бялку, жалеза, вітаміну $B_{12}$, якія ратуюць ад стомы і розных інфекцый.



КОРАТКА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным, блізкім і калегам Героя Сацыялістычнай Працы, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікалая Барысевіча ў сувязі з яго смерцю.**

Колькасць насельніцтва нашай краіны ў 2015 годзе ўзрасла на 13,3 тыс. чалавек да 9 млн 494,2 тыс.

**У Беларусі прапануецца штрафаваць на 100 базавых велічынь за правядзенне нелегальных экскурсій.**

**Беларусь падтрымлівае дзеянні Расіі ў Сірыі па барацьбе з міжнародным тэрарызмам. Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей.**

Міністэрствам інфармацыі 26 кастрычніка прынята рашэнне аб абмежаванні доступу да інфармацыйнага рэсурсу 379.by, на якім сістэматычна размяшчалася рэклама дзейнасці, звязанай з дастаўкай алкагольнай прадукцыі.

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## АПАВЯШЧАЛЬНІК У ПАКЕЦЕ І МЕТАЛІЧНЫ КОМІН

### Карэспандэнты «Звязды» выехалі на супрацьпажарны рэйд

**Не здзіўляйцеся, калі ў кастрычніку і лістападзе супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях завітаюць да вас дадому — у краіне праходзіць месячная акцыя «За бяспеку разам». Іх задача — праверыць, наколькі добра падрыхтавана жыллё да халадоў, вызначыць «слабыя месцы» ў доме, устанавіць, каму патрэбна, аўтаномны пажарны апавяшчальнік, правесці дадатковы інструктаж. Асабліва гэта важна напярэдадні і падчас школьных вакацый. У адзін такі рэйд адправіліся і карэспандэнты «Звязды».**




Фота Надзеі БУЖАН.

### ГРУПА РЫЗЫКІ

— Распрацаваны план, згодна з якім у акцыі па абыходзе людзей з «групы рызыкі» задзейнічаны ўсе суб'екты прафілактыкі — аддзел адукацыі, РАУС, аддзел сацыяльнай абароны, служба газавага нагляду, энерганагляд, — кажа першы намеснік начальніка Барысаўскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый Яшэня. — Асаблівую ўвагу мы надаем сем'ям, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Правяраем стан печаў, электраправодкі, раздаём дапаможныя ўлёткі. Па выніках акцыі плануем інфармацыю абагульніць. Там, дзе трэба дапамагчы ў рамонце абсталявання, праводкі, неабходна паставіць аўтаномны пажарны апавяшчальнік, — будзем аб гэтым хадайнічаць. Зараз ёсць інфармацыя пра 41 дом, дзе ёсць такая патрэба.

СТАР. 2

■ Паехалі!

# СЕРТЫФІКАЦЫЯ АЎТАСЭРВІСУ СТАНЕ ДОБРААХВОТНАЙ

**З першых дзён наступнага года ў нашай краіне плануецца адмяніць абавязковую сертыфікацыю паслуг СТА, паведаміла намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ пасля афіцыйнай цырымоніі адкрыцця міжнародных спецыялізаваных выстаў «Аўтасэрвіс. Механіка. Аўтакампаненты-2015» і «Дарожнае будаўніцтва-2015».**



І гэтую адмену спецыялісты сёння ўспрымаюць без асцярогі, лічыць намеснік міністра. Насамрэч баяцца няма чаго, бо «заканадаўства не адмяняецца, нормы законаў, стандартаў, правілаў захоўваюцца, будзе высокі кантроль за выкананнем нормаў. Сертыфікацыя — прэвентыўная мера пацвярджэння ўмоў адпаведнасці, яна адыходзіць, прычым на ўсёй тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза», — адзначыла Ірына Наркевіч. Сёння бізнес нашых краін лічыць абавязковую сертыфікацыю дадатковым тэхнічным бар'ерам у развіцці паслуг аўтасэрвісу, які неабходна пераадольваць.

Разам з тым спадарыня Наркевіч лічыць, што будзе вітацца добраахвотная сертыфікацыя паслуг СТА. У гэтым выпадку атрыманы сертыфікат будзе своеасаблівым пацвярджэннем высокага рэнамэ прадпрымальніка на рынку такіх паслуг.

## НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ ЯКАСЦІ

Нават у складаныя для эканомікі часы колькасць аб'ектаў аўтасэрвісу павялічваецца. Ірына Наркевіч упэўнена, што гэтая запатрабаваная сфера будзе надалей развівацца нават у цяперашніх умовах. Паводле яе слоў, сёння з 23 тысяч суб'ектаў гаспадарання, зарэгістраваных у рэестры бытавых паслуг, 14% складаюць структуры, якія займаюцца аўтасэрвісам. Тут існуе пэўная градацыя, калі ў асноўным у сферы абслугоўвання прысутнічаюць індывідуальныя прадпрымальнікі, доля якіх складае каля 60%. Але ў сферы аўтасэрвісу сітуацыя іншая, бо больш як палова такіх суб'ектаў з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі. «Гэта сведчыць, што існуе сегментацыя — ёсць буйныя комплексы, якія ўключаюць у сябе вялікую колькасць паслуг, і ёсць асобныя, больш простыя, паслугі, якія аказваюць індывідуальныя прадпрымальнікі», — патлумачыла Ірына Наркевіч. Структурнае развіццё гэтай сферы бізнесу падказвае спажывец, які галасуе рублём. Цяпер на першы план для аўтасэрвісу выходзіць тэхналагічнасць вытворчасці, каб прапаноўваць спажыўцу максімальна якасную паслугу. Сёння кліент вельмі эканомна расходуе свой бюджэт і ўласны час. Таму якасць паслугі пачынае займаць менавіта першае месца пры выбары аб'екта аўтасэрвісу. «А ў выніку абвастраецца канкурэнцыя. У выпадку, калі паслуга няякасная, спажывец проста другі раз не пойдзе», — упэўнена яна.

## УЖО 260 ГАРАЖНЫХ АЎТАМАЙСТЭРНЯЎ

Цяпер у нашай краіне зарэгістравана каля 260 аўтамайстэрняў, якія працуюць на тэрыторыях гаражных кааператываў. «Мы актыўна працягваем працаваць над тым, каб паменшыць колькасць нелегальнага аўтасэрвісу. Пакуль мы не можам сказаць з упэўненасцю, што з гэтай сітуацыяй справіліся, але ўсё больш і больш майстроў рэгіструюцца як індывідуальныя прадпрымальнікі і пачынаюць працаваць легальна», — патлумачыла сітуацыю Ірына Наркевіч. Яна выказала ўпэўненасць, што праз пэўны час будзе атрыманы чаканы эфект ад Указа №432, які дазволіў выкарыстоўваць у якасці аўтамабільных майстэрняў гаражы, што размешчаны на тэрыторыі гаражных кааператываў. «Сёння кіраўнікі ўсіх узроўняў працуюць па лініі актывізацыі дзеяння гэтага ўказа — з санітарамі, МНС, эколагамі. Гэта, з аднаго боку, аўтасэрвіс — высокатэхналагічны бізнес, дзе мы змяншаем бар'еры з боку кантрольных органаў для стымулявання яго развіцця. Аднак з іншага боку, ён можа забруджваць навакольнае асяроддзе, таму пэўны кантроль неабходны», — патлумачыла Ірына Наркевіч.

Удзел у міжнародных спецыялізаваных выставах «Аўтасэрвіс. Механіка. Аўтакампаненты-2015» і «Дарожнае будаўніцтва-2015», якія праходзяць у Мінску з 27 па 29 кастрычніка, прымаюць каля 50 кампаній з 6 краін. Мэта мерапрыемства — комплекснае прадстаўленне дасягненняў у сферы вытворчасці і эксплуатацыі транспарту, яго рамонту і абслугоўвання ўсёй дарожна-транспартнай інфраструктуры, арганізацыі і рэгулявання дарожнага руху. У экспазіцыі паказаны запасныя часткі і прылады для транспартных сродкаў, фарбавальнае абсталяванне, сродкі догляду і абароны, тэхнічныя вадкасці, абсталяванне для мыцця і рамонту аўтамабіляў, для дыягностыкі, шынамантажу, аўтатранспарт, дарожна-будаўнічая, землярыйная і камунальная тэхніка, тэхніка для рамонту і ўтрымання дарог. Упершыню падчас выставы пройдзе салон бюджэтных аўтамабіляў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Права

# ДА ЮРЫСТА НА ПРЫЁМ

## можна будзе трапіць бясплатна ў чацвер

**29 кастрычніка па ўсёй краіне пройдзе прафсаюзны прававы прыём грамадзян. Месцам правядзення стануць не толькі раённыя і гарадскія прафаб'яднанні, але і прадпрыемствы, установы. Любы ахвотны ў кожным райцэнтры зможа бясплатна пракансультавацца з юрыстам па пытаннях абароны працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў.**

У гэты дзень на прамой сувязі разам з інспектарамі ФПБ будуць дзяжурыць і спецыялісты Мінпрацы. Пра месца і час прыёму ў сваім горадзе можна даведацца ў абласных аб'яднаннях прафсаюзаў:

Брэсцкі рэгіён па тэлефоне (8 0162) 21 56 43,
Віцебскі — (8 0212) 37 36 12,
Гомельскі — (8 0232) 71 01 08,
Гродзенскі — (8 0152) 72 34 91,
Магілёўскі — (8 0222) 25 36 52,
Мінскі — (8 017) 327 39 23,
горад Мінск — (8 017) 203 88 78.

Падобныя прававыя кансультацыі ўжо праводзіліся вясной гэтага года і з верасня зноў сталі традыцыйнымі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Разважанні пра сучаснасць

# І Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ МОЖНА БЫЦЬ БАГАТЫМ, А НЕ ГАРБАТЫМ

**У нас распаўсюджана думка, што разбагацець на зямлі немагчыма. Не багацце нажывеш, а горб ад непасільнай працы. Але заснавальнік сялянска-фермерскай гаспадаркі «Цнянскія экапрадукты» Уладзімір АДАМОВІЧ, былы ваенны, не пабаяўся паспрабаваць сябе ў новай справе. І даказаў адваротнае...**



**Уладзімір АДАМОВІЧ ведае пра бульбу ўсё.**



**Такая прадукцыя радуе душу.**

КАЛІ Уладзімір быў у першым класе, бацька ўзяў яго з сабой да генерала, у якога рамантаваў машыну. Затым гаспадыня запрасіла іх дамоў. Малога вельмі ўразіла генеральская кватэра: высокая столь, паркетная падлога, шыкоўныя люстры. Хлапчуку з небагатай сям'і таксама захацелася так жыць.

— Тата, хачу быць генералам, — заявіў ён. Бацька адказаў, што для гэтага трэба добра вучыцца.

Як згадвае Уладзімір Леанідавіч, ён быў гультаяватым вучнем, неслухам. Узяцца за розум прымусілі абставіны: бацькі пераехалі. У новай школе, куды пайшоў сын, не было ранейшых сяброў, з якімі можна было пабегаць па вуліцы, пагуляць. Хлопец пачаў на ўроках слухаць настаўніка, унікаць у сказанае і, як вынік, стаў добра вучыцца. У восьмым класе Уладзімір паступіў у Суворраўскае вучылішча. Патрабаванні там да курсантаў былі вельмі высокія, і юнак пачаў здаваць пазіцыі ў вучобе. Чарговая тройка — і камандзір узвода не пусціць у звальненне, а так хацелася дадому! І суворавец узяўся за выпраўленне адзнак, нават па начах уставаў, каб лішні раз зазірнуць у падручнік...

Але генералам мой суразмоўца так і не стаў, ваенную акадэмію не закончыў. Туды накіроўвалі сыноў вышэйшых вайсковых начальнікаў, а яго супакойвалі, маўляў, чакай і дачакаешся сваёй чаргі. Даслужыўся Уладзімір Адамовіч да капітана, а ў 1989 годзе добраахвотна развітаўся з партбілетам. Так бы мовіць, да вялі чалавека. Спачатку адправілі ў Сцепанакерт, дзе здарыўся землятрус, затым — на палігон у Казахстан, на палявыя стрэльбы. Толькі прыехаў, як зноў пасылаюць на цаліну — на ўборку ўраджаю. А ён сям'і не бачыў паўгода. Калі заўпарціўся, выклікалі на парткамісію, дзе і кінуў чырвоную кніжачку члена КПСС на стол. Так закончылася ваенная кар'ера Уладзіміра Адамовіча. І ён, як відаць, ніяк не шкадуе, што стаў не генералам, а паспяховым бізнесменам: саўладальнікам лагойскага фармакалагічнага завода «Лекфарм», заснавальнікам сеткі аптэк «Камфарм», а цяпер і сялянска-фермерскай гаспадаркі «Цнянскія экапрадукты», якая займаецца вырошчваннем і перапрацоўкай бульбы. А ў маі сёлета да яе далучылі сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Косіна», які за паўгода змяніўся да непазнавальнасці.

> **Тыя, хто атрымлівае першыя вялікія грошы, прыбытак, імкнуцца адразу ж добра зажыць, купіць машыну, кватэру, бяздумна траціць капітал. Першыя сем гадоў я не даставаў з абароту ні капейкі, толькі ўкладваў.**

СВОЙ першы капітал будучы прадпрымальнік зарабляў, як і многія, у 90-я гады мінулага стагоддзя: чаўнаком, ганяў машыны з Германіі, гандляваў аўтазапчасткамі. У фармацэўтыку трапіў дзякуючы жонцы, правізару па спецыяльнасці.

— Уладзімір Леанідавіч, у тыя часы ўсе, хто пачынаў бізнес, мелі аднолькавыя стартавыя ўмовы. Нехта вырваўся наперад, але большасць прагарэла. У чым справа? — цікаўлюся ў Адамовіча.

— Тыя, хто атрымлівае першыя вялікія грошы, прыбытак, імкнуцца адразу ж добра зажыць, купіць машыну, кватэру, бяздумна траціць капітал. Першыя сем гадоў я не даставаў з абароту ні капейкі, толькі ўкладваў. А пачынаў справу з 14 тысяч долараў, з якіх 8 тысяч пазычыў. Знаёмыя ў банку параілі мне добрага фінансіста, які навучыў, што трэба працаваць адкрыта, плаціць падаткі, а крэдыты лепш браць у банку, нарошчваць абароты.

— А што прымусіла вас заняцца фермерствам?

— Шмат дасягнуў у фармацэўтыцы, стала нецікава. З 2001 года «Камфарм» у лідарах па аптовым продажы, а завод зможа і без мяне расці. Захацелася паспрабаваць свае сілы ў сельскай гаспадарцы, ды і з узростам бліжэй да зямлі пацягнула. Узяў спачатку дачу, пасадзіў першыя соткі бульбы. Назіраў, аналізаваў інфармацыю, можна сказаць, з інтэрнэту не вылазіў. На бульбе маеш грошай значна больш, чым на збожжы. Затраты адны і тыя ж, але «другі хлеб» дае ўраджайнасць у 10 разоў вышэйшую. Да таго ж заўважыў, што ў Беларусі няма ў гандлі чыстай бульбы, як у Еўропе. Словам, заняў свабодную нішу. Купіў неабходнае абсталяванне, першым у краіне пачаў мыць караняплоды, шліфаваць. А нядаўна набыў усё неабходнае для іх глыбокай перапрацоўкі.

Першы вопыт бульбавода, як згадвае Уладзімір Адамовіч, быў не вельмі ўдалым: бульба атрымалася паточанай драцянікам. Не дапамаглі нават сродкі аховы. Справа ў тым, што зямля тут была недагледжаная, неапрацаваная, суцэльная цаліна. Цяпер жа таму, хто знойдзе хоць адну бульбіну з чорнай кропкай, фермер абяцае заплаціць сто долараў.

Сёлета сярэдняя ўраджайнасць «другога хлеба» ў фермерскай гаспадарцы чакаецца на ўзроўні каля 500 цэнтнераў з гектара. Там, дзе культуру палівалі, ураджай значна лепшы. Паліў — самае каштоўнае і важнае пры вырошчванні бульбы, гаспадар сам праводзіў доследы з мінеральнымі ўгнаеннямі і вільготнасцю.

У ЕЎРОПЕ, нават калі дождж ідзе, бульбу паліваюць, бо яна любіць вільгаць і патрабуе шмат вады. 90 працэнтаў бульбы гаспадарка пастаўляе ў Расію. Цяпер жа экспарт прыпынілі, паколькі ў нашых суседзяў сёлета нядрэнна ўрадзіла гэтая культура. Акрамя таго, варта ўлічваць і фактар сезоннасці. Усе, хто вырасціў бульбу, адразу імкнуцца збыць яе. Таму кошт рэзка падае. Уладзімір Адамовіч упэўнены, што праз месяц прадасць сваю прадукцыю ў два разы даражэй.

— Акрамя бульбы, чым займаецца фермерская гаспадарка?

— Шмат чым, — смяецца фермер. — У пастаянных думках, развагах. Плануем выпускаць здаровае харчаванне, прарошчваць зерне, ужо купіў неабходную ўстаноўку. У прарошчаным зерні ў 2-3 разы павялічваецца колькасць карысных рэчываў, вітамінаў, мікраэлементаў. Людзі цікавяцца, шукаюць такое харчаванне, але яго вытворчасцю ніхто не займаецца ў Беларусі — вось вам яшчэ адна незапоўненая ніша. Хацелася б і малако вясковае разліваць. Цяпер нават у вёсках мала хто трымае кароў. Праўда, тут ёсць адно «але». Прадаваць сырадой можна толькі пасля тэрмічнай апрацоўкі пры 60 градусах. Але гэта ўжо будзе не вясковае малако, да якога мы прывыклі з дзяцінства, — сцвярджае мой суразмоўца.

НЕ кожны нават з паспяховых бізнесменаў рызыкнуў бы ўзяць сельгасарганізацыю, якая, так бы мовіць, у даўгах як у шаўках. Тым больш, што спачатку закрытае акцыянернае таварыства «Ахека» далучылі да ААТ «Косіна», даўгоў стала больш удвая. Прычым яны былі амаль роўныя актывам. Прайшло паўгода, і сітуацыя мяняецца на вачах: па валавых паказчыках прадукцыі гаспадарка выйдзе на 160%. Такога прыросту няма ні ў адным сельгаспрадпрыемстве Беларусі.

А пачаў новы гаспадар з элементарных навядзення парадку, дысцыпліны, звальнення дармаедаў і выпівох, аматараў пажывіцца за грамадскі кошт. У некаторых падраздзяленнях выявілі нават «мёртвых душ», за якіх зарплату атрымалі канкрэтныя асобы.

— Ад тых, хто крадзе ці думае толькі пра сябе, трэба без развагаў пазбаўляцца, — лічыць Уладзімір Адамовіч. — А тым, хто добра працуе, неабходна даць магчымасць добра зарабляць.

У мінулым годзе сярэдняя зарплата ў фермерскай гаспадарцы склала амаль 12 млн рублёў. За перапрацоўку, работу ў выхадныя дні, начныя змены прадугледжана двайная аплата. Кіраўнік Іван Іванавіч Магер — чалавек строгі, але справядлівы, з гультаямі ды абібокамі ў яго размова кароткая: пішы заяву і сыходзь. Раней на гэтым месцы працавала жанчына, якая шкадавала тых, хто не вельмі сумленна і адказна ставіўся да сваіх абавязкаў, выпіваў. Звольняць такога, а яна зноў возьме на працу: маўляў, усім жыць трэба.

Якімі ж якасцямі, рысамі характару павінен валодаць кіраўнік?

Са слоў Уладзіміра Леанідавіча, аналітычным розумам, уменнем разважаць, параўноўваць і прымаць рашэнне. А таксама харызмай, каб мог весці людзей за сабой, каб яму верылі. Напрыклад, бывае агранам ці заатэхнік — найразумнейшы чалавек, майстар сваёй справы, але ў яго няма харызмы. І з яго не атрымаецца добрага кіраўніка. «А наогул кіраўнікамі нараджаюцца, а не становяцца», — упэўнены Адамовіч.

— А вы ўсяго дасягнулі ў сваім жыцці?

— Хацеў быць мільярдэрам. Потым зразумеў, не трэба мне гэтага. Стаць багатым — не мэта, значна важнейшая дабрыня, імкненне дапамагаць людзям.

— Значыць, на першым месцы для вас дабрачыннасць?

— Тэлефануюць з розных фондаў, але не веру, што дапамога пойдзе па прызначэнні. Адказ мой ім такі «Не перашкаджайце працаваць». Калі даведаюся, што чалавеку патрэбны грошы на лячэнне, без развагаў даю колькі трэба.

Дадам, што на свае сродкі Уладзімір Адамовіч пабудаваў храм на радзіме бацькоў, у вёсцы Сеўрукі Баранавіцкага раёна.

У далучанай гаспадарцы бізнесмен зрабіў усё неабходнае, каб людзі самі змаглі зарабляць грошы, чаго раней не ўмелі. Тут ён пабудаваў рапсавы завод, хутка запрацуе лінія па перапрацоўцы бульбы. «Неабходна адкрываць перапрацоўчыя прадпрыемствы, якія б прыносілі прыбытак. Толькі на збожжы багатым не станеш, — упэўнены ён. — Вытворчасць збожжа прыносіць прыбытак, ды і то невялікі, толькі пры ўраджайнасці звыш 50 цэнтнераў з гектара. А бульба — гэта рэальныя грошы. «Косіна» спецыялізавалася на раслінаводстве, вытворчасці малака і мяса, сабекошт якога быў 35 тысяч рублёў за кілаграм, а прадавалі дзяржаве бычкоў жывой вагой па 20 тысяч рублёў за кілаграм. Рэжуць, напрыклад, выбракаванае цяля. Можа, яно важыць 100 кілаграмаў, а па дакументах праводзяць 50».

Цяпер каналы для махінацый перакрыты: створана камісія, якая падпісвае адпаведны акт. У выніку ў 10 разоў знізіўся падзеж маладняку і адпаведна павялічыўся сабекошт прадукцыі.

— І ўсё ж такі, як вывесці сельскую гаспадарку на новы ўзровень? У вас ёсць нейкія рэцэпты? — пацікавілася ў суразмоўцы.

— На зямлі павінен быць гаспадар, уласнік. Проста трэба даць 50% акцый прадпрыемства дырэктару. Толькі пры ўмове, што, напрыклад, за два гады ён падніме вытворчасць. І тады ён будзе імкнуцца да гэтага, паколькі ў яго з'явіцца асабістая зацікаўленасць. Калі ж за гэты час нічога не атрымаецца — забраць у яго акцыі і перадаць іншаму.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# АПАВЯШЧАЛЬНІК У ПАКЕЦЕ І МЕТАЛІЧНЫ КОМІН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

80-90 працэнтаў тых, хто гіне падчас пажару, у тым ліку і ў нас у раёне, — людзі, якія былі ў нецвярозым стане. Як правіла, іх вельмі рэдка застанеш дома, каб праверыць супрацьпажарны стан памяшкання. Калі нават і трапляем да іх, бачым, што гэтыя грамадзяне махнулі рукой літаральна на ўсё. Ільвіную долю сродкаў, якія яны здабываюць, выдаткоўваюць на алкаголь. Але працу праводзім і з імі — гэта ж таксама людзі. Яшчэ адзін вораг — нездаровы кансерватызм. Гаспадары дамоў часта адгаворваюцца, маўляў, яны гэтай печкай карыстаюцца два-тры дзясяткі гадоў і нічога не здарылася. Хоць гэтая печка ўжо ў літаральным сэнсе слова ледзь ліпіць...



Фота Надзеі БУЖАН.

## ЛЯ РАЗВАЛЕНАЙ ПЕЧЫ

Пазадарожнік «Лада» імчыць на поўнач ад Барысава. У старшага інжынера аддзела нагляду і прафілактыкі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Паўла Урбановіча — цэлае дасье на кожную сям'ю, дзе дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Візіт у вёску Бродаўка аказаўся няўдалым. Гаспадароў дома мы не засталі. Таму аўтамабіль мяняе курс на іншы населены пункт — Кастрыцу, да сям'і П.

— Мы да іх едзем ужо не ўпершыню, — расказвае старшы інспектар інспекцыі нагляду і прафілактыкі Барысаўскага ГРАНС Сяргей Тарасевіч. — Дзеці там не першы месяц знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы — бачыце, якая ў нас «база даных» назбіралася. Таму і правяраем пастаянна гэты дом. Да таго ж паставілі там неяк пажарны апавяшчальнік, вось цяпер і паглядзім, як ён там працуе.

Пакруціўшыся крыху па лабірынце вясковых вуліц, пазадарожнік спыняецца ля дабротнага прыватнага дома. Тут жа выбягае маленькі вяртлявы сабака, які бясконца брэша на нязваных гасцей. На грук у дзверы выходзіць гаспадыня дома.

— Дзень добры, пажарны нагляд, — прадстаўляецца Павел Урбановіч. — А дзе ваш малы?

— У школе, дзе ж яму яшчэ быць. Ды вы заходзьце, чаго стаяць пад дажджом.

Інспектары заходзяць у сціпла абстаўлены пакой і адразу ж кідаюць позірк на столь. Аўтаномны пажарны апавяшчальнік кудысьці знік. І тут пачынаецца даволі займальны дыялог, падчас якога некалькі разоў апаноўвала жаданне схапіцца за галаву...

— Мы ў вас ставілі прыбор. Куды ён падзеўся?

— Ды вось жа ён, — і з гэтымі словамі гаспадыня хаты адчыняе шафу, дастае адтуль завязаны цэлафанавы пакецік, у якім і ляжыць апавяшчальнік.

— А навошта вы туды яго паклалі? Вы маеце ўяўленне аб тым, для чаго апавяшчальнік патрэбен і як працуе?

— Безумоўна, ведаю. Калі хто курыць ці яшчэ аднекуль дым ідзе, ён пішчаць пачынае. А паклалі таму, што рабілі нацяжную столь. Не псаваць жа яе.

— Ну зразумейце вы, ён жа не павінен ляжаць мёртвым грузам. Пакладзіце прыбор хаця б на шафу. На сценку павесьце. Хіба ж мала месцаў у гэтым пакоі? Ён у вас і цяпер працаваць не будзе. Батарэйкі ж няма, я бачу. Трымайце памятку аб тым, як трэба карыстацца аўтаномным пажарным апавяшчальнікам.

Інспектары пачынаюць аглядваць печы. Дакранаюся да сценкі адной з іх — яшчэ цёплая, палілі не так даўно. Праўда, дзе-нідзе на корпусе печы відаць шчылінкі. Ды і некаторыя цаглiны ўнізе, акурат ля топачных дзверцаў, даверу не ўнушаюць. Здаецца, толькі крані некаторыя з іх — і ўся гэтая старэнькая канструкцыя тут жа абваліцца ўніз. Металічнага ліста перад печчу таксама няма.

— У вас жа печы трэба перарабляць. Чаго чакаеце? Маразы на носе. Гэтыя работы трэба было рабіць летам. А цяпер вы пакідаеце малых без цяпла... — ушчувае гаспадыню Павел Урбановіч. — Вы ж ведалі, што будзеце жыць тут. А ў вас печкі развальваюцца.

— Дык пячнік у бальніцы.

— І што, трэба чакаць, пакуль ён выйдзе адтуль? Звяртайцеся ў райвыканкам па дапамогу. Пачынайце зараз жа. Нельга ж карыстацца печкамі ў такім стане.

Павел Урбановіч знаходзіць лескі і лезе па іх правяраць стан дымахода. Назад інспектар спускаецца заклапочаны.

— У вас на гарышчы вельмі цікавая сітуацыя склалася. Невядома, калі абрынуліся цаглiны. Іх хтосьці склаў і накрыў кардонам. І як вы сабраліся зімаваць з такой печчу?

— Калі вернецца муж з працы, я скажу яму, каб заняўся гэтым.

— Чаму вы так бесклапотна ставіцеся да пытанняў бяспекі? — кажа інспектар, робячы апошнія пазнакі ў лісце. — Зараз у краіне дзейнічае Дэкрэт Прэзідэнта №18. Калі вы не забяспечыце ўмовы бяспечнага пражывання няпоўнагадовых, малых у вас могуць адабраць. Вы знаходзіцеся ў сацыяльна небяспечным становішчы. І паўкрока да таго, каб дзяцей забралі, ужо зроблена. Наступны раз прыедзем да вас праз тыдзень. Каб усё дарабілі. Часу ў вас было шмат...

## «ТАК МОЖНА І ХАТУ СПАЛІЦЬ»

Машына інспектараў кіруецца ў вёску Жыцькава. Па іх звестках, у тамтэйшым бараку жыве яшчэ адна сям'я, становішча малога ў якой прызнана сацыяльна небяспечным. Праўда, у дакументах ёсць разыходжанне наконт месца жыхарства сям'і. І праз некалькі хвілін становіцца зразумела, чаму: барак у Жыцькаве ўжо напалову знесены. Новае жыллё сям'і выдзелілі бліжэй да райцэнтра, у вёсцы Брусы.

На шчасце, і тут гаспадар аказаўся дома. Відаць па раскладзеных рэчах, што сям'я зусім нядаўна «сядзела на чамаданах». Міжволі кідаю позірк спачатку на адну печку, пасля на другую. Абедзве топкі без дзверцаў. На драўлянай падлозе няма і слядоў ад таго, што тут калісьці быў прыбіты металічны ліст...

— А як вы паліце ў печках? — задае пытанне Павел Урбановіч.

— Мы толькі ўвечары адной карысталіся, каб не змерзнуць ноччу, — адказвае К. — Ды і тое пакрысе. Пазычыў у суседа лескі, зірнуў на гарышча — як быццам усё добра. З другой печчу сітуацыя незразумелая: суседзі кажуць, што там комін наогул зняты.

— Ну што ж вы. Паглядзіце, ёй нельга карыстацца. Так жа дом спаліць можна. Тут, праўда, не зразумець, і хаце колькі гадоў, і хто быў яе ранейшым гаспадаром, і колькі часу яна прастойвала... Вазьміце памятку з інструкцыяй аб тым, як бяспечна паліць у печы. А дзе ваш сын?

— У Барысаве, у сястры.

— Пакуль вы тут не скончыце ўсе работы, пакуль не запрацуе належным чынам электраправодка, малога сюды перавозіць нельга. Толькі пасля таго, як вы будзеце гатовы, інфармуйце Барысаўскі ГРАНС аб тым, што вы ўсё скончылі і гатовы малога перасяліць. Да вас прыедзе інспектар. Толькі калі ён дазволіць, тады і перасяляйце сюды хлопчыка. Ёсць чым печку адрамантаваць?

— Ёсць пячная цэгла, каля ўваходу ляжыць. Кладку весці ўмею. Ды і з электрыкай я на «ты».

— Ну вось вы ўсё, што трэба, умееце рабіць. Дзейнічайце. А інспектар пасля праверыць.

Калі праверачнікі выходзілі з дома, у вочы кінуўся саржавелы металічны комін. Гаспадар пагадзіўся з тым, што яго трэба як мага хутчэй замяніць на цагляны...

Зразумела, што ніхто не паклапоціцца пра свой дом лепш за яго гаспадара. Але ж што становіцца прычынай абыякавых адносін да сваёй жа бяспекі — прывычка ўсё адкладваць на апошні момант ці проста лянота? Ці чамусьці папулярная і цалкам памылковая думка, што трагедыя можа здарыцца з кім заўгодна, толькі не са мной? Напэўна, адказ на гэтыя пытанні трэба шукаць у нас саміх...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НОВЫ БУДЫНАК ДЛЯ СЛЕДЧЫХ

**Новы будынак для раённага аддзела Следчага камітэта пабудавалі ў цэнтры Астраўца.**

— Астравец вельмі дынамічна развіваецца, за наступныя пяць гадоў яго насельніцтва павінна павялічыцца ўдвая. І мы хочам, каб горад быў утульным, бяспечным, каб для работы следчых былі створаны ўсе ўмовы, — зазначыў на цырымоніі адкрыцця будынка старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## АЎТОБУСАМ ДА МАСКВЫ

**Філіял «Аўтобусны парк №2» дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» адкрывае рух аўтобусаў маркі «МАЗ» умяшчальнасцю 42 пасажырскія месцы па міжнародным маршруце Мінск — Масква.**

З 1 снежня прызначаецца рэйс, які будзе адыходзіць з Мінска ў 23.30 праз дзень, з 2 снежня — у 21.30 праз дзень. Расійскі партнёр адкрывае рух аўтобусаў міжнароднага класа ўмяшчальнасцю 45 пасажырскіх месцаў па маршруце Мінск — Масква з 3 лістапада — гэта будзе рэйс з Мінска ў 21.30 праз дзень, з 4 лістапада — адпраўленнем з нашай сталіцы ў 23.30 праз дзень.

## ЗА ДЗЕНЬ — БОЛЬШ ЯК 11 КГ РТУЦІ

**Менавіта столькі вадкага металу за суткі давялося сабраць выратавальнікам у Лепельскім раёне і Баранавічах.**

У першым выпадку ртуць знайшлі на тэрыторыі прыватнага ўнітарнага прадпрыемства пры правядзенні земляных работ па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Метал знаходзіўся ў негерметычна ўпакаванай гумавай грушы на глыбіні 20 сантыметраў. Выратавальнікі-пажарныя правялі дэмеркурызацыйныя работы, у выніку якіх было сабрана тры кілаграмы ртуці.

А ў Баранавічах металічная закрытая ёмістасць з вадкім металам была знойдзена са знешняга боку каля агароджы пажарнай аварыйна-выратавальнай часці. У ёмістасці знаходзілася крыху больш за восем кілаграмаў ртуці. Забруджвання навакольнага асяроддзя, як і пацярпелых, не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне старшыні праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Другі нацыянальны тэлеканал» Кісялю Рыгору Леанідавічу з нагоды напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырае спачуванне старшыні праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Другі нацыянальны тэлеканал» Кісялю Рыгору Леанідавічу з нагоды напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

28 кастрычніка 2015 г.
№ 20 (360)


КАМПЕТЭНТНА

## НАША ТЭРЫТОРЫЯ

### *За чый кошт рамантаваць пад'езды і праезды вакол дома?*

Святлана ЯСКЕВІЧ



**На мінулым тыдні ў Баранавічах адбыўся семінар-практыкум для старшынь гарадскіх Саветаў дэпутатаў — абмяркоўвалі пытанні ўдасканалення работы ЖКГ і павышэння камфортнасці пражывання насельніцтва.**

Сустрэча прайшла па ініцыятыве пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. З адным з удзельнікаў семінара — **старшынёй Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў Мікалаем КРАСОЎСКІМ** — наша сённяшняя гутарка.

***— Што цікавага вы ўбачылі ў Баранавічах, які досвед калег, на ваш погляд, заслугоўвае ўвагі?***

— Адной з ключавых тэм семінара стала роля органаў мясцовага самакіравання, у тым ліку вулічных і дамавых камітэтаў, таварыстваў уласнікаў, у справе навядзення парадку на той тэрыторыі, дзе яны дзейнічаюць. Сёння мы гаворым не толькі пра клопат аб чысціні пад'ездаў, лесвічных клетак, але і пра парадак на тэрыторыі пры доме. Трэба, каб былі адрамантаваны лаўкі каля пад'езда, дагледжаны клумбы, прыбрана і абсталявана дзіцячая пляцоўка. І ніхто не зробіць гэта, калі не зробім мы самі — тыя, хто жыве ў дамах.

У Баранавічах удзельнікі семінара мелі магчымасць пазнаёміцца з работай камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея». Напомню, гэты камітэт аб'ядноўвае 25 дамоў, у якіх пражывае каля 5 тысяч чалавек. За час існавання камітэта знешні выгляд дамоў, пад'ездаў, двароў, якія ўвайшлі ў суполку, істотна памяняўся. Удалося не толькі навесці чысціню, прыгажосць, але, што асабліва важна, навучыцца яе падтрымліваць. Варта адзначыць, што «Надзея» ў свой час атрымала невялікі міжнародны грант, і гэта вельмі дапамагло камітэту.

Мы, дарэчы, яшчэ раней, задоўга да семінара, з пінскімі калегамі ездзілі знаёміцца з вопытам «Надзеі». А на семінары яго ўдзельнікі пагадзіліся з намі, што пераймаць гэты вопыт варта ў тым выпадку, калі ёсць спадзяванне прыцягнуць міжнародныя гранты. Без значнай фінансавай падтрымкі распачынаць падобныя праекты ў сучасных умовах было б складана.

Сёння ў справе добраўпарадкавання варта арыентавацца на меншыя па маштабах структуры, чым памеры цэлага мікрараёна. Напрыклад, ёсць дом, у якім усе кватэры прыватызаваныя. Але там наспела патрэба зрабіць рамонт у пад'ездзе, абсталяваць дзіцячую і спартыўныя пляцоўкі, паправіць бардзюры і тратуар. Для гэтага як мінімум трэба знайсці лідара, скажам, выбраць старшыню дамавога камітэта. Затым неабходна вызначыць крыніцы фінансавання. Дапамагчы грашыма можа орган мясцовай улады — праз сваю структуру ЖЭС альбо праўленне кааператыва, калі дом кааператыўны. І, вядома, спатрэбяцца сродкі саміх жыльцоў, якіх зможа арганізаваць неабыякавы чалавек — той самы лідар. Роля такога чалавека надзвычай высокая.

> За час існавання камітэта знешні выгляд дамоў, пад'ездаў, двароў, якія ўвайшлі ў суполку, істотна памяняўся.

***— Ці вынікае з гэтага, што ў Брэсце не будзе ўтварацца такіх вялікіх аб'яднанняў, як «Надзея», што арыенцір узяты на меншыя кааператывы?***

— Сапраўды, пакуль не будзе. Мы намераны развіваць і ўдасканальваць тую сістэму, якая склалася. Ёсць старшыні кааператываў і кіраўнікі таварыстваў, якія павінны арганізоўваць жыльцоў на вырашэнне пытанняў добраўпарадкавання. Вось на апошняй сваёй сесіі мы і запісалі ў рашэнні: «Рэкамендаваць выканкаму выпрацаваць сістэму ўдзелу насельніцтва ў асфальтаванні дваровых праездаў». У нас жа ёсць прыклады такога ўдзелу. Скажам, у прыватным сектары пракладваюць каналізацыю. Там ідзе фінансаванне па схеме: 70 працэнтаў — бюджэт, 30 — насельніцтва. Калі цягнем водаправод, фінансаванне ідзе ў прапорцыі 60 на 40. Трэба выпрацаваць правілы і для праездаў вакол дома.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ЧАЛАВЕК НА ЗЯМЛІ



## НАВУЧЫЦЦА БАЧЫЦЬ СЭРЦАМ

### *Былы старшыня пасялковага Савета дэпутатаў варыць самую смачную юшку і стварае «касмічныя» фігуры з дрэў*

Нэлі ЗІГУЛЯ

**Кожны з нас марыць пра цуды. Але іх сведкамі становяцца адзінкі. Кажуць, для гэтага трэба мець шчырае сэрца і чыстую душу. Фёдар Бязручка навучыўся заўважаць цуды ў самых звычайных рэчах. І робіць усё для таго, каб паказаць іх іншым. Таму, калі прагучалі словы: «Гэта трэба бачыць!», рашуча паехала глядзець. І не пашкадавала.**

### Мясцовая славутасць

Нават у падрыхтаванага дух займае, калі з-за павароту прасёлкавай дарогі нечакана з'яўляюцца ўнушальныя на выгляд фігуры. Не адразу разумееш, што гіганцкі кактус на фоне лесу — усяго толькі дрэва, а трохногі волат — зусім не іншапланетны НЛА... Калісьці гэта былі проста дрэвы. Па сутнасці, яны імі і засталіся. Той, хто сабраў іх тут разам, амаль не змяніў формы, але без яго намаганняў ніхто, верагодна, ніколі б не ўбачыў гэтыя «зашыфраваныя» ў іх фантасмагарычныя выявы. Шэсць гадоў таму аўтар незямных істот перанёс складаную аперацыю на сэрцы. З таго моманту год жыцця ён прыраўноўвае да двух і за кожны новы дзень не перастае дзякаваць магілёўскім медыкам. Менавіта пасля свайго «другога нараджэння» ён і навучыўся бачыць цуды ў звычайным.

— Раней я сотні разоў праходзіў міма той елкі, а тут нечакана «прачытаў» яе тайну. І так захацелася паказаць яе іншым. Сябры дапамаглі прывезці елку сюды, я распілаваў яе і зрабіў два асобныя «экспанаты». Я нічога не мяняў, кожны з іх сам па сабе цікавы. Толькі зняў кару, каб драўніна не прэла.



У Глушы пляцоўка з драўлянымі волатамі — мясцовая славутасць: такога дакладна нідзе няма.

— Людзі кажуць, што адчуваюць тут нешта дзіўнае, быццам трапляюць у іншую рэальнасць, — усміхаецца аўтар. — Некаторым гэта нагадвае старадаўняе капішча. А я называю сваё тварэнне чаканнем чагосьці касмічнага. У тое, што яно існуе, я шчыра веру.

### Каменная казка

Пра музей камянёў у Мінску ведаюць, напэўна, усе. Цікава паглядзець на валуны, звезеныя з усёй краіны, паслухаць легенды. Але ў пасёлку Глуша, што ў Бабруйскім раёне, таксама ёсць унікальныя экзэмпляры. І некалькі з іх размясціліся каля сядзібы глушанскага творцы. Адзін з іх наогул гіганцкі. На ім напісана «Божы дар». «Калі выбіваў надпіс, накрываў тканінай, каб ніхто не бачыў, што раблю. А потым было афіцыйнае адкрыццё... у прысутнасці сяброў», — усміхаецца суразмоўца.

Камень, дарэчы, не просты, з ім звязана цікавая легенда.

«Я яго з дзяцінства ведаю, — пяшчотна пагладжвае шурпаты бок шэрага велікана гаспадар. — Старыя расказвалі, што ён прыкрывае ўваход у сховішча, дзе знаходзіцца скарб. Дзецьмі мы ўсё хацелі гэты камень раскалоць. Палілі на ім вогнішча, потым халоднай вадой палівалі, каб лопнуў. Але безвынікова. А зараз вырашыў прыцягнуць яго з лесу да свайго дома. Калі падымалі, пад ім яшчэ адзін аказаўся, ён там і зараз ляжыць. Скарб, напэўна, схаваны пад ім. Так што шукальнікі прыгод могуць праверыць. А ў мяне ўжо сіл няма яго цягнуць.

### Юшка з сакрэтам

